Сугучча. Дні духоўнай культуры Расіі ў Беларусі ўрачыста адкрываюцца сёння ў канцэртнай зале «Мінск», паведамілі ў Міністэрстве культуры. Адбудзецца форум «Гістарычная, культурная і духоўная еднасць расійскага і беларускага народаў» у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і Доме Масквы. Пройдуць круглыя сталы «Роля святога князя Аляксандра Неўскага ў гісторыі станаўлення братэрства народаў Расіі і Беларусі», «Мова — душа народаў. Аб'яднальная роля літаратуры і тэатра ў супрацоўніцтве Расіі і Беларусі» і «Дастаеўскі як духоўны арыенцір рускага і беларускага народаў». Арганізавана выстаўка «Аляксандр Неўскі. Імя Расіі» і экспазіцыя да 200-годдзя з дня нараджэння Фёдара Дастаеўскага. У Доме Масквы будуць працаваць дыскусійныя пляцоўкі. Адкрыюцца выстаўкі дзіцячага малюнка «Душа Расіі» і экспазіцыя мастацкіх промыслаў, адбудзецца выступленне ансамбля «Бісквіт» і салістаў Марыінскага тэатра.